## Назоўнік
## (Nomen substantivum)

**Граматычныя катэгорыі**

1. Род:
• masculīnum (*m*) — мужчынскі;
• feminīnum (*f*) — жаночы;
• neutrum (*n*) — ніякі.
2. Лік:
• singulāris (*sg.*) — адзіночны;
• plurālis (*pl.*) — множны.

Назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку, называюцца pluralia tantum (*pl. t.*).

3. Склон:

• nominatīvus (*nom.*) — назоўны (хто, што?; функцыі ў сказе: дзейнік, іменная частка выказніка);

• genetīvus (*gen.*) — родны (каго, чаго, чый?; функцыі ў сказе: недапасаванае азначэнне);

• datīvus (*dat.*) — давальны (каму, чаму, для каго, для чаго, у каго?; функцыі ў сказе: ускоснае дапаўненне);

• accusatīvus (*acc.*) — вінавальны (каго, што, куды, калі?; функцыі ў сказе: прамое дапаўненне, акалічнасць);

• ablatīvus (*abl.*) — творны (кім, чым, дзе, калі, адкуль, ад каго, ад чаго, як, чаму?; функцыі ў сказе: ускоснае дапаўненне, акалічнасць);

• vocatīvus (*voc.*) — клічны (адпавядае зваротку).

4. Скланенне: 1, 2, 3, 4, 5-е.

Скланенне назоўніка вызначаецца па канчатку *gen. sg.*, якое ўказваецца ў слоўнікавай форме:

| Скланенне | Канчатак *gen. sg.* | Слоўнікавая форма |
|---|---|---|
| 1-е | -**ae** | terra, ae *f* |
| 2-е | -**i** | popŭlus, i *m* |
| 3-е | -**is** | pax, pacis *f* |
| 4-е | -**ūs** | fructus, ūs *m* |
| 5-е | -**ei** | fides, ei *f* |

У слоўнікавую форму назоўніка ўваходзіць:
1) поўная форма *nom. sg.*;
2) канчатак, частка формы або поўная форма *gen. sg.*;
3) скарочанае абазначэнне роду (*m*, *f*, *n*).

## Назоўнікі 1-га скланення

Гэта назоўнікі жаночага і мужчынскага роду, якія ў *gen. sg.* маюць канчатак -**ae**.

**Склонавыя канчаткі**

| Склон | Singulāris | Plurālis |
|---|---|---|
| *Nom.* | **a** | **ae** |
| *Gen.* | **ae** | **ārum** |
| *Dat.* | **ae** | **is** |
| *Acc.* | **am** | **as** |
| *Abl.* | **ā** | **is** |
| *Voc.* | **a** | **ae** |

**Узор скланення**
**silva, ae *f* — *лес***

| Склон | Singulāris | Plurālis |
|---|---|---|
| *Nom.* | silv-**a** | silv-**ae** |
| *Gen.* | silv-**ae** | silv-**ārum** |
| *Dat.* | silv-**ae** | silv-**is** |
| *Acc.* | silv-**am** | silv-**as** |
| *Abl.* | silv-**ā** | silv-**is** |
| *Voc.* | silv-**a** | silv-**ae** |

## Прыназоўнікі
## (Praepositiones)

Большасць прыназоўнікаў ужываецца з accusatīvus: ad — *да*, *у*, *для*; ante — *да*, *раней*; apud — *каля*, *пры*; contra — (*на*)*супраць*; inter — *паміж*, *сярод*; ob —*з-за* і інш.

Частка прыназоўнікаў ужываецца з ablatīvus: a (ab) — *ад*; cum — *з* (*кім*); de — *пра*, *ад*, *з* (*адкуль*); e, ex — *з* (*адкуль*); pro — *за*, *замест*; sine — *без* і інш.

Прыназоўнікі in — *у*, *на*; sub — *пад*, калі адказваюць на пытанне *куды?*, ужываюцца з accusatīvus; калі адказваюць на пытанне *дзе?*, — з ablatīvus.

Прыназоўнікі causā і gratiā — *для*, *дзеля* ўжываюцца з genetīvus, прычым ставяцца пасля слова, да якога адносяцца.

## Спражэнне дзеяслова sum, esse — *быць*
## у цяперашнім часе

**Praesens indicatīvi**
**(цяперашні час абвеснага ладу)**

| Асоба | Singulāris | Plurālis |
|---|---|---|
| 1-я | sum — *я ёсць* | sumus — *мы ёсць* |
| 2-я | es — *ты ёсць* | estis — *вы ёсць* |
| 3-я | est — *ён, яна, яно ёсць* | sunt — *яны ёсць* |
| Infinitīvus praesentis (інфінітыў цяперашняга часу): esse — *быць* | | |